*Таццяна Бярковіч*

## ПРА АДНУ ЛАКАЛЬНУЮ ГРУПУ НАПЕВАЎ КАРАГОДНЫХ ПЕСЕНЬ ВЕРХНЯГА ПАДНЯПРОЎЯ

Мэта дадзенага артыкула – прыцягнуць увагу да групы карагодна-гульнявых напеваў, лакалізаваных у дубровенска-мсціслаўска-руднянскім арэале ў басейне Верхняга Падняпроўя. Функцыянаванне іх у каляндарна-песенных традыцыях акрэсленых тэрыторый пацвярджаецца нотна-тэкставымі публікацыямі у складзе буйных музычна-фалькларыстычных калекцый М. Гарэцкага і А. Ягорава [1], Ф. Рубцова [5], «Віцебскае Падзвінне» (серыя «Традыцыйная мастацкая творчасць беларусаў») [7], а таксама сучаснымі экспедыцыйна-палявымі аўдыяфіксацыямі з фондаў Фонаархіва этнамузыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Разгляд карагодных напеваў дадзенай групы з пазіцыі іх музычна-тыпалагічнага адзінства прадпрымаецца ўпершыню.

У тыпалагічных сістэматыках карагодна-песенных традыцый, якія былі праведзены беларускімі этнамузыколагамі, вылучаюцца два прынцыпова розных напрамка. У аснове першага – раскрыццё *песенна-меладыйных тыпаў напеваў* на падставе музычна-стылістычных характарыстык (і пры абавязковай увазе за харэаграфічнага складніка). Другі напрамак грунтуецца на разглядзе *тыпаў карагодаў* як сінкрэтычнага комплекса ва «ўзаемадзеянні музычных і харэаграфічных структур, паэтыка-гульнявых і музычных суадносінаў» [8, с. 1].

Карагодна-гульнявыя песенныя традыцыі Беларускага Падняпроўя набылі асэнсаванне у рэчышчы абодвух тыпалагічных падыходаў (першы прадстаўлены ў даследаваннях З. Мажэйка [2; 4], З. Мажэйка і Т. Варфаламеевай [3]; другі – у працах В. Яшчанка [8]). Сістэматызацыя карагодных напеваў з боку ўстойлівасці *музычнага* комплексу адзнак дала розныя вынікі на матэрыяле песенных форм веснавога і зімовага замацавання. У корпусе веснавых карагодных напеваў, вылучаных З. Мажэйка ў *асобны тыпалагічны рад* веснавога песеннага цыкла, тры песенна-меладыйных тыпа («Страла», «Лука», «Проса») маюць устойлівы комплекс характарыстык, які ўключае будову меластрафы, складовую форму і рытмаформулу. Што датычыць калядных (шырэй – зімовых) карагодных напеваў, то яны разглядаюцца ў складзе дзвюх груп, што размяжоўваюцца па тэмпавым параметры як «хуткія танцавальныя і павольныя пластычныя» [3, с. 25]. І толькі ў напевах першай групы, якія абапіраюцца на рытмаформулу «Проса», прасочваецца аб'яднанне па рытмавым фактары. Адрозненні ў тыпалагічнай сістэматыцы карагодных напеваў звязаны з глыбіннай адметнасцю функцыянальнай прыроды веснавых і зімовых карагодна-гульнявых традыцый, пра што сведчаць аўтэнтычныя каментарыі: «вясенні карагоды “водзяць ‘змейкамі’ па ўсёй вуліцы з канца ў канец сяла” або “выводзяць на зялёную траўку ў лузе”, … калядныя “гуляюць на ігрышчах у хаце”» [там жа].

Напевы карагодных *дубровенска-мсціслаўска-руднянскай* групы маюць прымеркаванасць да каляднага перыяду («карагод, гулялі ў Каляды» – в. Ляды Дубровенскага раёна Віцебскага раёна, «у кыляды, гуляючы» – в. Багацькаўка Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.) з тэндэнцыяй выхаду ў разрад умоўна прымеркаваных і непрымеркаваных форм («у піліпыўкі і ў кыляды, і калі хоця» – в. Багацькаўка Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл., гульнявая карагодная – в. Ольша Руднянскага р-на Смаленскай вобл.). З адзначаным характарам функцыянавання ў традыцыі звязаны і больш рухомы (а значыць – менш устойлівы ў параўнанні з песенна-меладыйнымі тыпамі) комплекс музычна-стылістычных характарыстык напеваў.

Стабільным паказчыкам напеваў дубровенска-мсціслаўска-руднянскай групы з'яўляецца складовая структура песеннага вершарадка, мабільнымі паказчыкамі – форма верша- і меластрафы, музычна-рытмавая форма і ладава-меладыйны бок напеваў. У аснове напеваў ляжыць 5-складовая структура песеннага вершарадка, якая ўвасабляецца ў дзвюх разнавіднасцях музычна-рытмавай формы: з зацягваннем пятага складу () альбо з зацягваннем другога, чацвертага і пятага складу (). Напевы першай разнавіднасці складаюць пераважную колькасць у корпусе фіксацый (гл. прыклады 1–3). Форма вершарадка – рэфрэнная, у якой рэфрэн альбо ўраўнаважвае па працягласці вершарадок (abrr), альбо спалучаецца з паўторам другога паўрадкоўя асноўнага вершарадка (abrb). Большай рухомасцю вылучаецца форма меластрафы, заснаваная на спалучэнні дзвюх меладыйных фраз у наступных камбінацыях: AA$_1$BA$_2$, ABA$_1$B$_1$, AA$_1$BB$_1$.




№ 1. Зап. Ф.Рубцоў у 1920 г. у в. Ольша Руднянскага р-на ад А.С.Шакуравай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гульнявая карагодная // [5, с. 62, № 77].




№ 2. Зап. М. Гарэцкі і А. Ягораў у 1926 г.у в. Багацькаўка Мсціслаўскага р-на ад П. Гарэцкай.
«У піліпыўкі і ў кыляды, і калі хоцяׂ» // [1, № 136].




№ 3. Зап. М. Гарэцкі і А. Ягораў у 1926 г. у в. Багацькаўка Мсціслаўскага р-на ад П. Гарэцкай.
«У кыляды, гуляючы». // [1, № 154].

*Малюнак 1* – Нотныя прыклады

Спецыфічнасць ладамеладыйнага боку напеваў дубровенска-мсціслаўска-руднянскай групы звязана з апорай на ангемітонны (безпаўтонавы) ладамеладыйны комплекс у аб'ёме кварты / квінты. Як вядома, дадзены ладавы комплекс нітуе вялікі пласт каляндарна-песенных гучанняў на Магілёўскіх тэрыторыях. Аднак у напевах карагодных з уласцівай ім меладыйнай ускладнасцю формы на аснове камбінавання дзвюх асноватворных фраз ангемітонныя праявы ладу суіснуюць нароўні з дыятанічным яго раскрыццём (гл. прыклад 2), у чым праяўляецца своеасаблівая «зонная» прырода ладу. Звернем ўвагу яшчэ на адну акалічнасць, звязаную з варыянтнасцю тэрцавага тона (гукі ***g*** – ***gis*** у прыкладзе 2), што стварае двaістасць / пераменнасць стану тона-апоры (гукі ***a*** альбо ***e*** ў прыкладзе 2).

Спроба разгляду карагодных напеваў дубровенска-мсціслаўска-руднянскага арэала як асобнай групы на падставе інтэгратыўнай ролі музычна-рытмавага фактару дазваляе акцэнтаваць наступнае. Падобныя з'явы карагодна-гульнявой песеннай традыцыі, якія ў ракурсе сістэмна-тыпалагічнага даследавання буйных рэгіянальных масіваў апынаюцца на перыферыі навуковага досведу як умоўна прымеркаваныя, могуць быць вылучаны (па аналогіі з «малымі» каляндарнымі гульнямі) для спецыяльнага разгляду як рэпрэзентанты ніжэйшага яе таксона. Вывучэнне іх у аспектах агульнага / спецыфічнага, ўстойлівасці / зменлівасці змушае да карэкціроўкі і ракурса погляду, і даследчага інструментарыя.

**Спіс літаратуры:**

1. Гарэцкі, М. Народныя песьні з мэлёдыямі / М. Гарэцкі, А. Ягораў. – Менск : Выд-ва ін-та беларус. культуры, 1928. – 157 с.
2. Мажэйка, З. Я. Песні Беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.
3. Мажэйка, З. Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 392 с.
4. Можейко, З. Я. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
5. Русские народные песни Смоленской области : в записях 1930 – 1940-х гг. / сост., расшифр., коммент. Ф. Рубцова. – Л. : Сов. композитор, 1990. – 160 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 797 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 910 с.
8. Ященко, В. Н. Хороводные традиции Могилевского Поднепровья : дис. … канд. искусствовед. : 17.00.02 / В. Н. Ященко ; Белорус. гос. акад. музыки. – Минск, 2002. – 21 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ